**М. А. Курыпка**

# ЖАНРАВАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ ВАЕННАЙ ПРОЗЫ ПРА ДРУГУЮ СУСВЕТНУЮ ВАЙНУ Ў АНГЛІЙСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

Другая сусветная вайна, займаючы асаблівае месца ў мастацкай літаратуры, стала не проста вострай і актуальнай тэмай, а невычарпальнай крыніцай, дзе на спецыфічным жыццёвым матэрыяле пісьменнікі вынаходзяць рашэнне ідэйных і эстэтычных праблем мінулага і сучаснасці.

Справядліва адзначыць, што у навуковай літаратуры няма адзінага погляду на тлумачэнне паняцця «ваенная проза». Сучасную ваенную прозу ў розных літаратурах цяжка ўкласці ў адну агульную схему, паколькі яе жанравая спецыфіка адрозніваецца па сваім сюжэтна-вобразным пачатку, акцэнце на выключнай гераічнасці ці яго адсутнасці, разнастайнасці стылю і жанравых формаў. Па словах М. Брэдберы, «у выніку распаўсюджвання мультыкультуралізму і глабальнага ўзаемапранікнення тэксту, у брытанскай літаратуры пачалі пашырацца межы апавядання, і адбываліся ўнутраныя змены традыцыі» (Bradbury, M., 1994). Пашырэнне мастацкіх межаў патрабуе і істотнага перагляду традыцыйнага зместу тэрміна «ваенная проза».

Ваенная проза канца XX ст. уяўляе сабою неаднародную жанравую прастору, якая складаецца з мноства форм, даведзеных да крайняй, амаль што рэлятывісцкай мяжы. Змястоўнасць кожнага новага твора вызначаецца як яго гістарычным кантэкстам, так і пастаяннымі пошукамі мастакоў, што дазваляе сучаснай ваеннай прозе дэманстраваць не толькі сваю дынамічнасць і развіццё, а таксама і пастаянства, уласцівае дадзенай тэме.

Англійскія не проста ствараюць ці дапаўняюць летапіс Другой сусветнай вайны, яны даследуюць яе маральна-этычныя і філасофскія праблемы, душэўны стан чалавека, яго ўспаміны, думкі і пачуцці. Ваенная проза стварае вялікае поле для эксперыментаў, дзе шматлікія тэмы, сюжэты, мастацкія прыёмы і сродкі ўзаемаўплываюць і дапаўняюць адзін аднаго.

Апісанне вайны часам выпадае з поля зроку пісьменніка і, як заўважае А. Шышкін, «адбываецца недзе за сцэнай і служыць толькі фонам» (Шишкин, А. П., 1983). Асабліва гэта праявілася ў сучаснай англійскай літаратуры ў творах І. Мак'юэна «Чорныя сабакі», М. Фрэйна «Шпіёны», Г. Свіфта «Валан» і «Іншы свет» і інш., дзе вайна выступае як гістарычны фон, але сюжэтная праблема развіваецца ў рамках не столькі гістарычнай, колькі псіхалагічнай праблематыкі.

Да ваеннай прозы можна аднесці і творы, якія не столькі паказваюць саму вайну, колькі ўзгадваюць яе як крыніцу псіхалагічнага канфлікту, які мае нябачны ўплыў на лёсы герояў. У фокусе твораў знаходзяцца пошукі чалавекам самога сябе, аналіз сваіх учынкаў, перагляд мінулага, што сведчыць аб жаданні пісьменніка даследаваць псіхіку чалавека ў суадносінах з гісторыяй і самім сабою. Вайна ж падаецца не толькі як гістарычная рэальнасць, але і як сродак узмацнення псіхалагічнага элемента сюжэта, што дае магчымасць убачыць, што вайна пакідае пасля сябе.

Тэма вайны ўскосна праходзіць праз раманы брытанскага пісьменніка К. Ішыгура («Там, дзе ў смузе ўзгоркі» («A Pale View of Hills», 1982), «Мастак зыбкага свету» («An Artist of the Floating World», 1986), «Рэшткі дня» («The Remains of the Day», 1989), «Калі мы былі сіротамі» («When We Were Orphans», 2000). Аўтар наўмысна адыходзіць ад апісання ваенных падзей. Гаворачы словамі даследчыцы В. Мінінай, «Ішыгура разам з чытачом разважае аб прычынах вайны, яе наступствах, уплыве вайны на жыццё простых грамадзян».

Галоўны герой рамана Грэма Свіфта «Валан», Прэнтыс, не мае непасрэднага дачынення да вайны, ён сучасны архівіст Лонданскага аддзела па злачынствах, якія паліцыя не змагла вырашыць ці перастала даследаваць. Знойдзеныя дзённікі яго бацькі, які падчас вайны быў брытанскім разведчыкам у Францыі, дазваляюць Прэнтысу выйсці са свайго псіхалагічнага адчужэння і па-новаму зазірнуць у мінулае. Разам з яго начальнікам Куінам ён прыходзіць нарэшце да высновы, што яго бацька не зусім герой, а агент, які гуляў у двайную гульню.

В. А. Судлянкова заўважае, што «сучаснай літаратуры пра вайну ўласцівы асаблівы хранатоп, калі ў большасці твораў – два і болей часавыя пласты, а падзеі, як правіла, адбываюцца як мінімум у дзвюх краінах» (Судленкова, О. А., 2006). Пры гэтым важную ролю адыгрывае праблема ўспамінаў: пісьменнікі не абавязкова падрабязна апісваюць саму вайну, але чытач увесь час узгадвае яе атмасферу, адчувае яе трагічны ўплыў на гісторыю, маральны і псіхалагічны стан чалавека. Герой знаходзіцца ў пастаянных пошуках душэўнага супакою і раўнавагі.

Сучаснай літаратуры ўласціва не толькі праблема памяці мінулай вайны, але і імкненне пераасэнсаваць тыя падзеі з сучасных пазіцый. Гэта не проста жаданне падаць чытачу свежыя вобразы ваеннага часу, але і прага зразумець чалавека ва ўсёй яго глыбіні, складанасці і нават супярэчнасці. Большасць брытанскіх аўтараў канца ХХ ст. працягваюць распрацоўваць самыя розныя

сацыяльна-псіхалагічныя тэмы ў літаратуры, у тым ліку і ў ваеннай прозе, прыкладам чаго з’яўляецца раман М. Брэга «Вяртанне салдата» («The Soldier's Return», 1999) – першы раман з чатырох кніг пісьменніка, аб’яднаных агульнай тэмай: адаптацыя людзей да пасляваеннага жыцця.

Характэрнай рысай творчасці пісьменнікаў-постмадэрністаў у цэлым з’яўляецца тое, што практычна кожны герой ускосна трапляе пад уплыў мінулага, у тым ліку і Другой сусветнай вайны, што сведчыць аб узаемасувязі паміж індывідуальным жыццём і падзеямі агульначалавечага маштабу. Часам гэтая ўзаемасувязь выглядае хаатычнай, невыразнай ці палемічнай, калі чалавек не можа зразумець сам, што на самой справе з’яўляецца праўдай, а што вымыслам. Гэта дазваляе гаварыць аб шматпланавасці гісторыі, розныя версіі якой у роўнай ступені маюць права на тлумачэнне.

Акрамя гэтага, у англійскай ваеннай прозе прасочваецца з’яўленне элементаў фантастыкі, імкненне да творчага пошуку і рэпрэзентацыі альтэрнатыўных гістарычных працэсаў ці сферы будучыні. Нягледзячы на сур’ёзнасць тэматыкі,шмат англійскіх пісьменнікаў займаюцца канструяваннем альтэрнатыўнай гістарычнай рэальнасці, што пашырае мажлівасці ваеннай прозы да ўзроўню антыўтопіі. Альтэрнатыўная ваенная гісторыя Брытаніі прадстаўлена ў рамане Л. Дэйтана «Брытанскія СС» («SS–GB», 1978), у якім брытанскі Скотланд-Ярд вымушаны працаваць пад камандаваннем нацыстаў, якія акупіравалі краіну. Пазней гэты жанр пашырыўся папулярным раманам Р. Харыса «Фатэрланд» («Fatherland», 1993) і раманам О. Шырса «Супраціўленне» («Resistance», 2007), у якім расказваецца пра нямецкае нашэсце на Англію ў канцы 1944 года пасля няўдалай высадкі саюзнікаў у Нармандыі.

Сучасная брытанская ваенная проза характарызуецца і істотным узмацненнем «дэтэктыўнай» лініі. Сінтэз ваеннага і дэтэктыўнага раманаў найбольш яскрава праяўляецца ў творах Дж. Хігінса, У. Бойда і інш. Па сваіх прынцыпах апісання і асэнсавання падзей, а разам з тым па мастацкай рэалізацыі аўтарскай задумы, дэтэктыўны па сваёй сутнасці раман у выніку змяшчае шматлікія элементы псіхалагічнага, палітычнага ці гістарычнага раманаў. Вялікі пласт дэтэктыўнай ваеннай прозы ў сучаснай брытанскай літаратуры прадстаўлены творамі пісьменніка К. Фолета, да якіх адносяцца «Вушка іголкі» («Eye of the Needle», 1978), «Ключ да Рабэкі» («The Key to Rebecca», 1980), «Палёт шэршня» («Hornet Flight», 2002), «Галкі» («Jackdaws», 2001) і інш.

Падобная разнастайнасць дазваляе сучаснаму літаратуразнаўству лічыць беспадстаўным ізаляваць «ваенную прозу» ад іншых літаратурных жанраў. Даследаванне сучаснай ваеннай прозы пераконвае ў разнастайнасці і глыбокім узбагачэнні гэтай тэмы на мяжы XXI ст. Агульнапрынятая думка аб тым, што вайна – гэта справа злачынцаў, фарміруе эстэтычную аснову сучаснай ваеннай прозы, якая ў пошуках асэнсавання супярэчлівасці гераічнасці і трагічнасці ўвасабляе дыялектыку ваеннай рэчаіснасці.